УДК 947.6:28

**А. В. Саўчанка**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ДЗЕЙНАСЦЬ КАПІТУЛАЎ УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ КАНЦА XVIII – XIX СТСТ.

Артыкул прысвечаны разгляду дзейнасці капітулаў уніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі ў гістарыяграфіі канца XVIII – XIX стст. Акцэнтуецца ўвага на тым, што нягледзячы на дастаткова распаўсюджанае меркаванне пра капітулы як інстытут у каталіцызме і некаторых галінах пратэстантызму, яны былі характэрны і для ўніяцкай царквы. У артыкуле адзначаны шматлікія праблемныя моманты, якія падымаліся аўтарамі канца XVIII – XIX стст. пры разглядзе інстытута капітулаў уніяцкай царквы. Адзначаецца, што галоўную ролю ў аналізе дзейнасці капітулаў адыгралі даследчыкі, якія былі пераважна святарамі ці выхадцамі са святарскага асяродку. Падкрэсліваецца, што кожны з іх часта меў свой погляд на ролю і месца капітулаў ва ўніяцкай царкве: некаторымі даследчыкамі прыводзіліся аргументы адносна самастойнасці інстытута капітулаў, іншыя аўтары сцвярджалі, што капітулы прыўнесены на ўніяцкую глебу з каталіцызму, таму не маюць даўніх каранёў і традыцый. Шэраг аўтараў адзначаў важную ролю капітулаў у гісторыі царквы (у тым ліку і ў справе ўз'яднання ўніяцтва з праваслаўем), іншыя сцвярджалі, што роля і значэнне занадта перавышана некаторымі даследчыкамі і прадстаўнікамі саміх капітулаў.

Вывучэнне гэтых дыскусій, як і розных падыходаў у асэнсаванні дзейнасці капітулаў, дазваляе лепш зразумець асаблівасці развіцця ўніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі.

**Ключавыя словы**: гісторыя, рэлігія, Брэсцкая унія, уніяцкая царква, уніятцтва, капітул.

**Для цытавання:** Саўчанка А. В. Дзейнасць капітулаў уніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі ў гістарыяграфіі канца XVIII – XIX стст // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 2 (275). С. 12–16. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-2.

**A. V. Savchenko**
Belarusian State Univercity

# THE ACTIVITY OF THE CHAPTERS OF THE UNIATE CHURCH ON THE TERRITORY OF BELARUS LANDS IN THE HISTORIOGRAPHY WORKS OF THE LATE 18th – 19th CENTURIES

The article is devoted to the study of the heads of the Union on the territory of Belarus in the works of researchers of the 19th century. The attention is focused on the fact that, despite the rather widespread opinion about the chapters as an institution in Catholicism and some branches of Protestantism, they were also characteristic of the Unian Church. The article notes numerous problematic points raised by the authors of the 19 century. when considering the establishment of branches of the Union Church. It is noted that the main role in the analysis of the activities of chapters was played by researchers, who were mostly priests or came from a priestly environment. It is emphasized that each of them often had his own view on the role and place of chapters in the Union Church: some researchers argued about the independence of the institution of chapters, other authors argued that the chapters were brought to union soil from Catholicism, so they do not have long-standing roots and traditions. A number of authors noted the important role of the chapters in the history of the Church (including in the matter of reunification with Orthodoxy), others argued that the role and significance were overestimated by some researchers and representatives of the chapters themselves.

The study of these discussions, as well as various approaches to understanding the role and place of capital institutions, allows us to better understand the features of the development of the union church on the territory of Belarus.

**Keywords:** history, religion, Brest Union, Union Church, unionism, chapter.

**For citation:** Savchenko A. V. The activity off the chapters of the Uniate church on the territory of Belarus lands in historiography works of the late 18th – 19th centuries. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 2 (275), pp. 12–16. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-2 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Гісторыя ўніяцкай царквы, існаванне якой на тэрыторыі Беларусі ахоплівае 243 гады (1596–1839 гг.), і сёння мае праблемныя палі і кірункі для дадатковага даследавання. Адным з праблемных пытанняў з'яўляецца гісторыя інстытута капітула і яго дзейнасць.

Пытанне дзейнасці, ролі і месца капітула ва ўніяцкай царкве выклікала спрэчкі, якія разгарнуліся ў працах даследчыкаў канца XVIII – XIX ст. Таму вывучэнне гістарыяграфіі дадзенага інстытута, розных падыходаў да яго ацэнкі дазваляе зразумець асаблівасці развіцця ўніяцкай царквы на беларускіх землях.

**Асноўная частка** Слова «капітул» (часам ужываецца слова «капітула») мае лацінскае паходжанне (лац. – Capitilum) і ў каталіцызме і некаторых галінах пратэстантызму (як англіканская царква) азначае калегію (раду) клірыкаў пры біскупскай кафедры (кафедральны капітул) або калегіяльнай царквы (калегіяльны капітул) [1, с. 147]. Так, Wielka encyklopedia powszechna ilustrowana) у артыкуле "Kapitula katedralna" прыводзіць прыклад кафедральных капітулаў у Царстве Польскім на 1818 г. і называе колькасць членаў у гэтым органе царкоўнага кіравання (12 членаў: 4 прэлаты і 8 канонікаў), а таксама пералічвае некалькі капітулаў каталіцкай царквы, сярод якіх Магілёўскі, Віленскі, Жмудскі, Жытомірскі, нават Саратаўскі, якія налічвалі 9 членаў у сваім складзе [2, s. 725]. Але інстытут капітулаў быў характэрны і для ўніяцкай царквы [1, с. 147]. III том "Nowa encyclopedia powszesna" [3] і "Katolicka encyklopedia" [4] змяшчаюць інфармацыю пра інстытут кафедральнага капітула на прыкладзе грэка-каталіцкай царквы (дакументы, якія рэгламентуюць колькасць членаў гэтага органа датуюцца 1875 і 1894 гг. [4, s. 671]). У вышэйназваных артыкулах даказваецца, што інстытут як капітулы ўзніклі небеспадстаўна, маючы некаторыя каталіцкія «дадаткі» у плане функцый, месца ў іерархіі і ўпраўленні царквой.

Вывучэнне капітулаў як з'явы ва ўніяцкай царкве на тэрыторыі Беларусі пачалося ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.

Адной з такіх прац было спецыялізаванае выданне "Dzieje dobroczynności krajowej i zagranicznej" [5], якое друкавалася з дазволу ваеннага губернатара А. Рымскага-Корсакава. Так, у томе за 1821 г. на с. 1014 прыводзіцца «Навіна пра Луцкі кафедральны капітул», дзе паказваецца дзейнасць капітула ў Луцку ад 1364 г. і прыводзіцца шэраг актаў Папаў Рымскіх [5, s. 1014].

Том III "Dzeje doroczynności..." дае інфармацыю пра капітулы як інстытуты ўніяцкай царквы (артыкул А. Маеўскага "O Herarchii kościoła Ruskiego z Rzymskim zjednpczonego"). Аўтар артыкула адзначае праблемныя моманты існавання гэтага інстытута, звяртаючы ўвагу на парушэнні права кананічнага ў функцыянаванні капітулаў ва ўніяцкай царкве. Адным з такіх момантаў указваецца незаконнасць аднаўлення Брэсцкага капітула (маецца на ўвазе рашэнне пра аднаўленне дзейнасці Брэсцкага капітула актам ад 2 ліпеня 1809 г.) [6, s. 179]. Падобныя сцвярджэнні аўтара здаюцца дзіўнымі, бо падставай для аднаўлення Брэсцкага капітула з'яўлялася ў тым ліку спасылка на яго доўгае існаванне (з часоў Ягайлы), грамата караля Сігізмунда III ад 20 ліпеня 1595 г. і Указ (у арыг. – повеление) Паўла I ад 20 мая 1798 г. (на гэты ўказ, як аснову і падставу для аднаўлення, у акце 1809 г. спасылаюцца двойчы) [7, арк. 4, 4 адв., 5].

Пры тым варта адзначыць, што аўтар ці не ведае, ці наўмысна апускае той факт, што Ясафат Булгак (на момант 1823 г. ужо 6 год як мітрапаліт уніяцкіх цэркваў у Расіі, а на 1809 г. ён займаў пасаду епіскапа Брэсцкага) не з'яўляўся першым, хто аднавіў дзейнасць Брэсцкага капітула. Архіўныя крыніцы сведчаць, што яшчэ ў 1775 г. епіскап Брэсцкі Антанін Младоўскі, абапіраючыся на прашэнні з боку белага духавенства, на «зямельным фундушы пры кафедральнай Брэсцкай царкве аднавіў капітул» [8, арк. 1 адв]. У акце аб яго аднаўленні пацвярджаецца даўнасць існавання падобнага інстытута са спасылкай яшчэ на часы епіскапа Брэсцкага і Уладзімірскага Іпація Пацея (грамата ад 20 лютага 1598 г.), дазвол ад Святога прастолу і акт караля Сігізмунда III ад 13 красавіка 1598 г., у якіх вядзецца гаворка пра трох членаў капітула (архіпрасвітэра, архідыякана і хартулярыя) [8, арк. 1 адв.]. У акце адзначаецца, што пры аднаўленні штат павялічваецца на 1 асобу (дадаецца кустош) і агучваецца намер павялічыць штат да 6 асоб [8, арк. 1 адв.].

Нягледзячы на гэта, А. Маеўскі спрабуе зменшыць аргументы ў абарону капітулаў як даўняга інстытута, адмаўляючы іх існаванне пры Пацее [5, 185].

У гэтым жа нумары (том III "Dzeje doroczynności...") і ў томе IV (1824 г.) [10] можна знайсці і разгромны артыкул Платона Сасноўскага пад назвай "Uwagi nad artykułem: O herarhii Kościoła Ruskiego z Rzymskim zjednoczonego". П. Сасноўскі даў моцную базу для развіцця тэмы інстытута капітула ў гістарыяграфіі XIX ст.

Дзякуючы гэтым працам можна даведацца (на прыкладзе цытат и вытрымак з дакументаў) пра наяўнасць капітулаў у такіх гарадах, як Навагрудак [10, s. 222–227], Вільня [10, s. 227–230], Полацк [10, s. 230–231], Уладзімір (маецца на ўвазе Уладзімір-Валынскі) [10, s. 324–327], Брэст [10, 327–333], Луцк [10, s. 333–335]. Акрамя таго, П. Сасноўскі падымае значную праблему, а менавіта памылкі ў актах цытаваных з «рымскай» (лацінскай) мовы, што ў выніку прыводзіць да скажэння сэнсу [11, s. 556].

Важная роля ў даследаванні дзейнасці капітулаў належыць Плакіду Янкоўскаму, сыну архіпрэсвітэра Гаўрыіла, аднаго з членаў Брэсцкага капітула, адказнага да 1836 г. за захаванне дакументальнай спадчыны (дакументаў гэтага

капітула) [12, 119]. Плакід Янкоўскі, маючы доступ да дадзеных дакументаў, распавядае пра некаторыя аспекты дзейнасці Брэсцкага капітула, прыводзіць вытрымкі з цудам не згарэлых дакументаў у нарысах, якія аб'ядналі ў адну кнігу пад агульнай назвай «Записки сельского священника» [12, с. 116 –127].

Праца С. Л. Паеўскага (добрага сябра Плакіда Янкоўскага) «О церквах Брестской капитулы» [13] мае раздзел «Капитульные священники», у якім аналізуецца матэрыяльны стан настаяцеляў. Аўтар піша пра добрае матэрыяльнае ўтрыманне святароў [13, с. 23] (пацверджанне гэтага знаходзіцца і ў актавых кнігах Уладзімірскага і Брэсцкага капітула за 1608 і 1681 гг. [13, с. 23]). Акрамя таго, у працы С. Паеўскага утрымліваецца інфармацыя пра капітульныя цэрквы. Цікава, што з 7 узгаданых у працы цэркваў (1 галоўная кафедральная і 6 рознай ступені важнасці і значнасці) непасрэдна капітульнымі названы толькі тры: Свята-Троіцкая на Войтавай вуліцы г. Брэста [13, с. 38–50], у гонар Нараджэння Багародзіцы ў сяле Гершанковічы [13, с. 50–56], у гонар Іаана Багаслова ў сяле Лабачова [13, с. 58–61].

Зусім коратка ўзгадаў пра Брэсцкі капітул у сваёй працы «Исторический очерк православия, католичества в Белоруссии и Литве» Р. Кіпрыяновіч [14]. Пра гэты орган сказана толькі тое, што ў яго склад увайшлі лепшыя прадстаўнікі белага духавенства, і з 1819 г. яны неаднаразова падавалі скаргі на захоп базыяльянамі царкоўных маёмасцяў, іх памкненне бязмежна панаваць ва ўніяцкай царкве і весці яе ўсімі спосабамі да злучэння з каталіцтвам (у арыг. – латинством) [14, с. 253].

Сваю нішу ў гісторыі даследавання ўніяцкай царквы ў пачатку XIX ст. – канцы 1820-х, барацьбы белага духавенства за свае правы, дзейнасці ў гэтым накірунку капітулаў у цэлым і Брэсцкага капітула ў прыватнасці займае П. Баброўскі з яго працай «Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I» [15]. У гэтым даследаванні Баброўскі спрабаваў акрамя апісання крызісу ўнутры царквы паказаць захады і спробы яе рэфармавання такімі асобамі, як мітрапаліты І. Лісоўскі, Г. Кахановіч і А. Красоўскі, якіх ён лічыў не толькі натхняльнікамі, але і саюзнікамі капітула. Фактычна ім была прааналізавана дзейнасць Брэсцкага капітула ў справе барацьбы за правы белага духавенства, які і складаў аснову гэтага органа. Павел Баброўскі спрабаваў паказаць адным з галоўных дасягненняў у дзейнасці капітула Указ ад 9 кастрычніка 1827 г., які прадпісваў прымаць у склад манахаў-базыльян толькі ўніятаў з добрым веданнем царкоўнаславянскай мовы і ўсходняга (праваслаўнага) абраду, а таксама спрыяў адкрыццю семінарый і вучылішчаў для ўніятаў [15, с. 392–393]. Фактычна П. Баброўскі акцэнтаваў увагу на тым, што гэты ўказ уздзейнічаў на Я. Сямашку (на той момант асэсара II дэпартамента Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі) і падштурхнуў яго прапанаваць свой план па рэформе ўніі.

Можна меркаваць, што такая цікавасць да гісторыі капітула была абумоўлена памкненнем П. Баброўскага ўшанаваць свайго дзядзьку – М. Баброўскага, які займаў пасаду віцэ-афіцыяла капітула, пасаду віцэ-старшыні Брэсцкай кансісторыі і павучаў святароў у практычным выкананні грэчаскіх абрадаў [16, с. 67], і ўпісаць яго імя ў гісторыю ўз'яднання ўніятаў з праваслаўем.

Праца П. Баброўскага стала аб'ектам крытыкі з боку прафесараў М. Каяловіча [17] і І. Філевіча [18]. Крытыка Каяловіча засноўвалася на тым, што члены капітула (у арыг. ён гаворыць пра 2 інстытуты – Брэсцкі капітул і Віленскую кансісторыю) ставілі за мэту аднаўленне ўніі з царкоўна-славянскім богаслужэннем (невядома па якім прыкладзе), але падчас рэалізацыі гэтай мэты выступалі як інструмент ціску на базыльян і простых прыходскіх святароў. Галоўны дакор членам капітула з боку М. Каяловіча заключаўся ў тым, што яны настойвалі на захаванні сувязі з Рымам і польскай мовай у навуцы і грамадскай сферы (М. Каяловіч у сваім разборы працы П. Бабpоўскага гэта назваў «ліберальным паланізмам» паводле плана А. Чартырыйскага) [17, с. 28]. Таксама ён указваў на тое, што адзін з мітрапалітаў І. Красоўскі, якога П. Баброўскі падаў як саюзніка капітула, насамрэч нават не падтрымаў намераў і планы капітула [17, с. 29].

Філевіч жа ўказваў на той факт, што Баброўскі і Сасноўскі (у адрозненне ад Сямашкі) не мелі сувязі з народам, а таксама казаў пра пасіўнасць М. Баброўскага ў руху ўніяцтва да праваслаўя [18, с. 29, 30]. Каяловіч падкрэсліваў, што П. Баброўскі хваліў капітул не па заслугах і акцэнтаваў увагу на патрэбе больш крытычнага стаўлення да падбору і прагляду крыніц [17, с. 71]. І. Філевіч сваю крытыку завяршыў сцвярджэннем, што жыццё дзеячаў капітула, як удзельнікаў гістарычнага моманту, канешне, уяўляе нейкуюю цікавасць, але можна абысціся без глыбокага вывучэння іх біяграфій [18, с. 31]. Крытыка работы П. Баброўскага ні ў якім разе не змяншае яго ўклад у гісторыю даследавання ўніяцкай царквы, але нівелюе шэраг яго пастулатаў і сцвярджэнняў наконт ролі інстытута капітула ў цэлым і Брэсцкага капітула ў прыватнасці ў працэсах канца 1820-х–1830-я гг. XIX ст.

**Заключэнне.** Такім чынам, класічнае вызначэнне капітула тлумачыць яго як калегію

(раду) клірыкаў пры біскупскай кафедры (кафедральны капітул) або калегіяльнай царквы (калегіяльны капітул) у каталіцызме і ў некаторых галінах пратэстантызму. Але інстытут капітулаў быў характэрны і для ўніяцкай царквы, паколькі ў актах аб аднаўленні падкрэсліваецца яго даўнасць. Вывучэнне капітулаў як з'явы ва ўніяцкай царкве на беларускіх землях пачалося ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Галоўную ролю ў разглядзе дзейнасці капітулаў уніяцкай царквы адыгралі даследчыкі, якія былі па адукацыі святары (А. Маеўскі, Платон Сасноўскі, Плакід Янкоўскі) ці былі выхадцамі са святарскага асяродку (Павел Бабр0ўскі, Міхаіл Каяловіч, Іван Філевіч). Кожны з іх часта меў свой погляд на ролю і месца капітулаў ва ўніяцкай царкве: калі П. Сасноўскі прыводзіў аргументы на карысць самастойнасці інстытута капітулаў і падкрэсліваў яго важную ролю ў гісторыі царквы, то Р. Кіпрыяновіч і П. Бабр0ўскі адзначалі вялікую ролю капітулаў у справе ўз'яднання ўніяцкай царквы з праваслаўем.

Пры гэтым гістарыяграфія XIX ст. мае прыклады і дастаткова негатыўнай ацэнкі дзейнасці капітулаў на беларускіх землях. Напрыклад, А. Маеўскі, М. Каяловіч, І. Філевіч указвалі, што капітул прыўнесены на ўніяцкую глебу з каталіцызму, таму не мае даўніх каранёў, а яго роля і значэнне занадта перабольшаны некаторымі даследчыкамі і прадстаўнікамі саміх капітулаў.

**Спіс літаратуры**


1. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. Мінск: Бел. Энцыкл., 2001. 368 с.
2. Wielka encyklopedya powszechna ilustrowana. T. XXXIII–XXXIV (Joerg Jan Krysrtian Gotfryd – Karyszew Mikołaj). Warszawa: Drukarnia Aleksandra Tadeusza Jeyierskiego, 1897. 1013 s.
3. Nowa encyklopedia powszesna PWN. T. 3: I – Ł / [red: Prowadzący Dariusz Kalisiewicz; red. Nacz. Barbara Pertozolin-Skowrońska]. Warszawa: Wydawnictwo naukowe PWN, 1997. 189 s.
4. Encyklopedia katolicka. T. VIII: Język – Kino. Lublin, 2000. 1455 s.
5. Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi. Wilno: Typografia A. Marcinowskiego, 1821. Rok 2. Styczen, Marzec, Kwiecień, Maj, Czerwiec, Lipiec, Sierpień, Wrzesień, Parzdziernik, Listopad, Grudzień, 1821. 2229 s.
6. Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi. T. III, № 9–12. Wilno: Typografia A. Marcinowskiego, 1823. 454 s.
7. Росийский государственный исторический архив г. Санкт-Петербурга (РГИА). Ф. 823. Оп. 2. Д. 1443. Л. 4, 4 об, 5, 5 об, 6, 6 об., 7, 7 об.
8. РГИА. Ф. 823. Оп. 2. Д. 2155. Л. 1, 1об., 2, 2 об., с. 3, 3 об., 4, 4 об., 5, 5 об., 6.
9. Sosnowski P. "Uwagi nad artykułem: O herarhii Kościoła Ruskiego z Rzymskim zjednoczonego" // Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi. T. III, N 9–12. Wilno: Typografia A. Marcinowskiego, 1823. 454 s.
10. Sosnowski P. "Uwagi nad artykułem: O herarhii Kościoła Ruskiego z Rzymskim zjednoczonego" // Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi. T. IV, N 1–4. Wilno: Typografia A. Marcinowskiego, 1824. 406 s.
11. Sosnowski P. "Uwagi nad artykułem: O herarhii Kościoła Ruskiego z Rzymskim zjednoczonego" // Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi. T. V, N 6. Wilno: Typografia A. Marcinowskiego, 1824. 584 s.
12. Янковский П. Записки сельского священника. Минск: Медиал, 2019. 256 с.
13. Паевский С. Л. О церквах Брестской капитулы в начале 2-й половины XVIII века. Вильна, 1887. 65 с.
14. Киприанович Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. Минск: Изд-во Белорусского Экзархата, 2006. 351 с.
15. Бобровский П. О. Русская греко-униатская церковь в царствование Александра I. Минск: Энциклопедикс, 2014. 412 с.
16. Зубко А. О греко-унитской церкви в Западном крае России. Минск: Медиал, 2019. 100 с.
17. Коялович М. О. Разбор сочинения П. О. Бобровского: «Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I». Историческое исследование по архивным документам и указание на основании архивных документов иной постановки всех главных униатских вопросов того времени. СПб., 1890. 71 с.
18. Филевич И. Вопрос о воссоединении западнорусских униатов в его новейшей постановке: по поводу исследования П. О. Бобровского «Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I». СПб., 1890; Варшава, 1891. 31 с.


**References**


1. *Religiya i tsarkva na Belarusi:* entsykl. daved. [Religion and church in Belarus: encyclopedia reference book]. Ed. board: G. P. Pashkou [et al.]. Minsk, Bel. Entsykl. Publ., 2001. 368 p. (In Belarusian).

2. *Wielka encyklopedya powszechna ilustrowana* [The great general illustrated encyclopedia]. Warsaw, Drukarnia Aleksandra Tadeusha Jeyierskiego Publ.,1897, vol. XXXIII–XXXIV. 1013 p. (In Polish).

3. *Nowa encyklopedia powszesna PWN* [New general encyclopedia]. Vol. 3: I – Ł. Warsaw, Wydawnictwo naukowe PWN Publ., 1997. 189 p. (In Polish).

4. *Encyklopedia katolicka* [Catholic encyklopedia]. Lublin, 2000. Vol. VIII. 1455 p. (In Polish).

5. *Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi.* [The history of Domestic and Foreign Charity with Information for the Improvement of its Servants]. Wilno, Typografia A. Marcinowskiego Publ., 1821, Rok 2. 2229 p. (In Polish).

6. *Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi.* [The history of Domestic and Foreign Charity with Information for the Improvement of its Servants]. Wilno, Typografia A. Marcinowskiego Publ., 1823. vol. III, no. 9–12. 454 p. (In Polish).

7. Russian State Historical Archive in St. Peterburg (RSHA). Fund 823. I. 2. F. 1443.

8. RSHA. Fund 823. I. 2. F. 2155.

9. Sosnovski P. Comments on the article: On the herarchy of the Russian and Roman Churches united. *Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi* [The history of Domestic and Foreign Charity with Information for the Improvement of its Servants]. Wilno, Typografia A. Marcinowskiego Publ., 1823, vol. III, no 9–12. 454 p. (In Polish).

10. Sosnovski P. Comments on the article: On the herarchy of the Russian and Roman Churches united. *Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi* [The history of Domestic and Foreign Charity with Information for the Improvement of its Servants]. Wilno, Typografia A. Marcinowskiego Publ., 1824, vol. IV, no. 1–4. 406 p. (In Polish).

11. Sosnovski P. Comments on the article: On the herarchy of the Russian and Roman Churches united. *Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z Wiadomościami ku Wydoskonaleniu jej Służącymi* [The history of Domestic and Foreign Charity with Information for the Improvement of its Servants]. Wilno, Typografia A. Marcinowskiego Publ., 1824, vol. V, no. 6. 584 p. (In Polish).

12. Yankovsky P. *Zapiski sel'skogo svyashchennika* [Notes from a village priest]. Minsk, Medial Publ., 2019. 256 p. (In Russian).

13. Payevsky S. L. *O tserkvakh Brestskoy kapituly v nachale 2-y poloviny XVIII veka* [About the churches of the Brest Chapter at the beginning of the 2nd half of the 18th century]. Vilna, 1887. 65 p. (In Russian).

14. Kiprianovich G. Ya. *Istoricheskiy ocherk pravoslaviya, katolichestva i unii v Belorussii i Litve.* [Historical essay of Orthodoxy, Catholicism and Union in Belarus and Lithuania]. Minsk, Izd-vo Belorusskogo Ekzarkhata Publ., 2006. 351 p. (In Russian).

15. Bobrovsky P. O. *Russkaya greko-uniatskaya tserkov' v tsarstvovaniye Aleksandra I* [Russian Greek-Uniate Church during the reign of Alexander I]. Minsk, Entsiklopediks Publ., 2014. 412 p. (In Russian).

16. Zubko A. *O greko-unitskoy tserkvi v Zapadnom kraye Rossii* [About the Greek-Unite Church in the Western Region of Russia]. Minsk, Medial Publ., 2019. 100 p. (In Russian).

17. Koyalovich M. O. *Razbor sochineniya P. O. Bobrovskogo: "Russkaya greko-uniatskaya tserkov' v tsarstvovaniye imperatora Aleksandra I." Istoricheskoye issledovaniye po arkhivnym dokumentam i ukazaniye na osnovanii arkhivnykh dokumentov inoy postanovki vsekh glavnykh uniatskikh voprosov togo vremeni* [Analysis of the essay by P. O. Bobrovsky: "The Russian Greek-Uniate Church during the reign of Emperor Alexander I." Historical research based on archival documents and an indication, based on archival documents, of a different formulation of all the main Uniate issues of that time]. St. Petersburg, 1890. 71 p. (In Russian).

18. Filevich I. *Vopros o vossoyedinenii zapadnorusskikh uniatov v yego noveyshey postanovke: po povodu issledovaniya P. O. Bobrovskogo "Russkaya greko-uniatskaya tserkov' v tsarstvovaniye imperatora Aleksandra I"* [The question of the reunification of Western Russian Uniates in its newest formulation: regarding the research of P. O. Bobrovsky "Russian Greek-Uniate Church during the reign of Alexander I". St. Petersburg, 1890; Warsaw, 1891. 31 p. (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Саўчанка Андрэй Віктаравіч** – аспірант гістарычнага факультэта. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220037, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, вул. Мендзялеева, 36). E-mail: andrijsauczanka1997@gmail.com

## Information about the author

**Savchenko Anrdey Victorovich** – PhD student, Faculty of History. Belarusian State University (6, Mendeleyeva str. 220037, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: andrijsauczanka1997@gmail.com

*Пастуніў 05.10.2023*